НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА ШУМІЛІНШЧЫНЫ

# СЬВІТАНАК

№ 6 (96), КРАСАВІК 2009 ГОДА

*Беларусь, твой народ дачакаецца Залацістага, яснага дня!*
*М. Багдановіч.*

**http://haradok.belarda.org - сайт нашага рэгіёна**

## ГУЛЬНЯ Ў АДНЫ ВАРОТЫ

**25 красавіка завершылася палітычнае мерапрыемства пад назвай выбары ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Але ці былі сапраўдныя дэмакратычныя выбары?**

Нязменная старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына безапеляцыйна заявіла: "Расці і расці еўрапейскаму электарату!" Найперш спадарыня Ярмошына засяродзіла ўвагу на тым, што еўрапейскі электарат у параўнанні з беларускім выглядае зусім нягеглым. На парламенцкія выбары ў Венгрыі і прэзідэнцкія выбары ў Аўстрыі прыйшло менш за палову выбаршчыкаў. А на Беларусі нібыта праявілі актыўнасць 79,1% людзей ад тых, што маюць права голасу. Як правіла, любая краіна падчас палітычных кампаній нагадвае "поле бітвы". Ідзе жорсткая барацьба ў кожнай выбарчай акрузе, на кожным выбарчым участку . Кандыдаты што ёсць сілы змагаюцца за думкі і галасы выбаршчыкаў. Кампанія ідзе цікава і напружана. Лішне казаць, што ў нашай краіне было якраз усё наадварот – стаяла цішыня, асабліва там, дзе балатаваліся кандыдаты ад улады. Пра выбары нагадвалі толькі некалькі плакатаў ды сціплыя аб'явы ў мясцовай раёнцы. Усе акругі былі безальтэрнатыўнымі, акрамяадзінай: па Амбрасавіцкай сельскай акрузе № 8 балатаваліся два кандыдаты. Трэба заўважыць, што некаторыя "прыкметы жыцця" усё ж такі падаваў кандыдат у дэпутаты Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў А. Я Ацясаў. Аляксандр Ягоравіч выступіў на Обальскім керамічным заводзе, да таго ж у некаторых паштовых скрынях былі яго ўлёткі. Змест улёткі наступны: фота кандыдата і кароткія біяграфічныя звесткі. Канкрэтнай праграмы не было. Зрэшты, у раённай газеце "Герой працы" апублікавалі размову галоўнага рэдактара са старшынёй прэзідыума Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў А. Я Ацясавым. Дакладней, гэта была справаздача аб здабытках Шуміліншчыны. Матэрыял проста стварав у выбаршчыкаў ілюзію аб тым, як дэпутаты ўзводзяць вакзалы, перакрываюць дахі, перакідваюць праз рэкі масты і пракладаюць каналізацыю. Прасцей кажучы, забяспечваюць сытае і заможнае жыццё простаму люду. А пра тое, як даць больш правоў і свабод таму ж народу, для таго, каб ён сам стварав сабе годнае жыццё – ні слова. Астатнія кандыдаты-прызначэнцы ў раённы Савет і сельскія Саветы выбарчыя кампаніі ў сваіх акругах не праводзілі. Ды і навошта ім марнаваць час, калі гэта па-сутнасці для ўсіх пустая фармальнасць? А між іншым, не пашкодзіла б ім ведаць пра тое, што статус кандыдата сам па сабе ўжо надае вялікія магчымасці. За месяц агітацыйнай кампаніі можна значна паўплываць на грамадскую думку, змяніць свядомасць людзей. У выніку наш раён атрымаў чарговую кагорту прызначаных на дэпутацкія пасады кіраўнікоў і спецыялістаў арганізацый і гаспадарак. Без сумневу, па загадзя ўзгодненым спісам і квотам. І, як заўсёды, па "рэкамендацыях" зверху. Па папярэдніх даных, раённай і сельскіх тэрытарыяльных выбарчых камісій дэпутатамі "зрабілі" 35 чалавек у раённы Савет і 98 чалавек у сельскія Саветы. Яўку забяспечылі па ранейшаму высокую, яна амаль дасягнула ўзроўню савецкіх часоў – 90, 4 адсоткаў выбаршчыкаў прынялі ўдзел у галасаванні. Выбары без выбару, кандыдаты без сапернікаў. Пераможцы без пераможаных. Нязыблемая маналітнасць сістэмы. Абсалютная адмова нават ад бачнасці дэмакратыі. Многія выбаршчыкі задаюцца пытаннямі: для чаго ўладам была патрэбна гэта імітацыя? Бясспрэчна, пачалася кампанія па "выбарам" кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі. Таму на кампаніі па мясцовых выбарах адпрацоўваўся механізм па ўтрыманні манаполіі на ўладу. Правячая групоўка правярала наменклатуру на трываласць, а народ на пакорлівасць. Беларусь нездарма лічыцца апошняй еўрапейскай краінай аўтарытарнага тыпу. Прычым гэта аўтарытарнасць самая прымітыўная – уся краіна ператворана ў вялікі калгас. Пажыццёвы старшыня гэтага калгаса штогод забяспечвае стабільнасць. Стабільнасць без працвітання. Стабільнасць узамен на скрадзены выбар. І наколькі гэтыя выбары былі чэснымі, судзіць вам, паважаныя чытачы. Бо кожны з нас таксама крыху сацыёлаг і па размовах з сябрамі, суседзямі і калегамі па рабоце рэальна ведае, якім шляхам патрапілі ў Саветы "слугі народа".

**Аляксандр Шчамлёў.**

## Ці проста заслужыць давер?

**На подступах да мясцовых выбараў, прызначаных на 25 красавіка, па Амбрасавіцкай выбарчай акрузе № 8 ужо прадбачылася нейкая інтрыга. Павышаны інтарэс да гэтай падзеі праявілі не толькі выбаршчыкі, але і раённыя ўлады.**

Варта адзначыць, што гэта была, бадай, адзіная акруга ў раёне, дзе на адзін дэпутацкі мандат прэтэндавалі два кандыдаты. Ад выбаршчыкаў, якія пражываюць па вуліцы Зялёнай, Кааператыўнай і Лясной шляхам сбору подпісаў быў вылучаны актывіст партыі БНФ, рэдактар грамадска-палітычнай газеты "Світанак" А. М. Шчамлёў. Апазіцыйны кандыдат у маленькім аграгарадку?. Сенсацыя палягае яшчэ і ў тым, што такое вылучэнне на мясцовых выбарах адбылося ўпершыню за ўсю гісторыю Шумілінскага раёна. А гэта ўжо першы сур'ёзны крок да еўрапейскіх стандартаў. Улады ў сваю чаргу выставілі ў кандыдаты мясцовую настаўніцу Амбросавіцкай СШ І. А. Матэленак. На гэтым выбарчая місія настаўніцы скончылася. Затое "бэнэфавец" Шчамлёў не спаў у шапку і актыўна праводзіў кампанію "ад дзвярэй да дзвярэй". Апазіцыйны кандыдат хадзіў па кватэрах, тлумачыў людзям сваю праграму, кожнаму ўручаў грамадскую газету, якую сам і выпускаў. Дарэчы, даволі значную частку выбаршчыкаў на карысць незалежнага кандыдата пераковаць не прыйшлося. Задоўга да выбараў шмат высілкаў яго ініцыятыўнай групы пайшло на "выбіванне" сродкаў для газіфікацыі шасці двухпавярховых дамоў. Пра доўгія пакуты жыхароў вуліцы Зялёнай у аграгарадку Амбросавічы чытачы не раз даведваліся на старонках нашай газеты. Аднак раённае кіраўніцтва з самага пачатку адчула пагрозу для паслухмянай сістэмы вертыкалі. Адразу быў задзейнічаны адміністратыўны рэсурс: кіраўнікі мясцовага прадпрыемства СВК "Прыазёрны" узяліся апрацоўваць калгаснікаў, а чыноўнікі райвыканкама правялі "інструктаж" сярод настаўнікаў. Па вёсцы папаўзлі чуткі, што былі спробы адміністрацыйнага ўціску на тых выбаршчыкаў, якія паставілі подпісы за партыйнага актывіста Аляксандра Шчамлёва. Трэба аддаць людзям належнае: ніхто не спалохаўся страціць працу і ніводзін выбаршчык не адазваў свой подпіс. Відавочна, штосьці паступова змяняецца ў свядомасці людзей і сельскай глыбінцы. Ды толькі вось свядомасць кіраўнікоў выбарчай камісіі ды іх начальнікаў засталася ў далёкай мінуўшчыне савецкіх часоў. У працы камісіі на "апазіцыйным" участку адразу выявіліся нестыкоўкі. Няясна, чаму мянялася колькасць выбаршчыкаў у спісе: спачатку было 114, затым стала 98 – і куды яны раптам падзеліся, няўжо так хутка пакінулі белы свет? У дзень выбараў зноў "уваскрэслі": у спісе значылася 103 чалавекі. Расклад па Амбрасавіцкай сельскай акрузе быў наступны: у датэрміновым галасаванні прынялі ўдзел 31 выбаршчык, на дом ( без адпаведнай заявы) завезлі чатыры бюллетэні, у дзень галасавання на участак прыйшлі 59 чалавек. Усяго прагаласавала 94 чалавекі, 14 прагласавалі супраць усіх, а 9 бюлетэняў прызнаны несапраўднымі. Не выключана, што значная колькасць несапраўдных бюлетэняў тлумачыцца тым, што за пару дзён да выбараў у калгасе выдалі зарплату. Выбаршчыкі , якія галасавалі "пасля ўчарашняга" маглі крыху разгубіцца і ў кабіне для галасавання. Як бы там ні было, але галоўнае парушэнне выбарчага Кодэксу адбылося пры падліку галасоў. Старшыня выбарчай камісіі, дырэктар Амбрасавіцкай сярэдняй школы Е. М. Лысянкова толькі пусціла кандыдатаў у залю для галасавання, але прысутнічаць пры падліку галасоў не дазволіла ( парушэнне артыкула 13 выбарчага Кодэксу). Увогуле усе члены камісіі дапусцілі грубае парушэнне арт. 55 падлік галасоў на ўчастку для галасавання пры правядзенні выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў. Бюлетэні па кожнай акрузе і кандыдату не лічылі особна. Больш таго, бюлетэні не былі прачытаны ў голас – члены камісіі моўчкі лічылі іх і складалі ў кучкі. Пасля кожны з іх па чарзе падыходзіў да другога стала, дзе сядзелі старшыня і сакратар і здавалі пачак бюлетэняў, памечаных паперкамі з надпісам. Такім чынам, нават члены камісіі не ведалі, колькі галасоў усяго было пададзена за дадзенага кандыдата. Пасля паўгадзіннага шаптання старшыні камісіі з сакратаркай нарэшце быў абвешчаны пратакол. Настаўніца І. Матэленак атрымала 46 галасоў, а Шчамлёву дасталося 25. Трэба думаць, што пасля такога "падліку" вынікі выбарнага фарсу задаволяць і яго рэжысёраў і заказчыкаў. Падаваць скаргі на парушэнні бессэнсоўна – у законе ўсё роўна нічога не прапісана пра паўторны падлік галасоў. Ды і па ўсяму відаць, што суды і пракуратура стаяць на баку вертыкалі ўлады. Нам застаецца толькі зафіксаваць усе парушэнні і выявіць парушальнікаў, каб затым праз пэўны час кожны з іх атрымаў па заслугах.

**Алесь Шумскі.**

## "Світанак" ў Інтэрнэце

Шаноўны чытач! Раней чым з паштовай скрыні вы можаце чытаць нашу газету ў Інтэрнэце. Газета размешчана для спампавання на сайце http://haradok.belarda.org/ у раздзеле "Незалежныя выданні" на старонцы "Світанак".

**Вынікі апошняга апытання на сайце http://haradok.belarda.org/**

**Ці магчымы на Беларусі кіргізкі сцэнар?**

Не ..... 46%
Магчыма, калі ўзрасце жабрацтва ..... 22%
Магчыма, калі ўзрасце карупцыя ..... 18%
Магчыма, калі ўзмацніцца апазіцыя ..... 4%
Магчыма, калі пажадае Расія ..... 10%

## ДИНАМИКА ПОВЫШЕНИЯ ЦЕН

**В приведённой ниже таблице предлагается цена на некоторые наиболее ходовые товары в г. п. на 25.4.2010 г. в Шумилинском районе.**

| | |
|---|---|
| **Хлеб чёрный** | **1540** |
| **Батон** | **1790** |
| **Молоко 3,5%, 1 л** | **1660** |
| **Сахар, 1 кг** | **2590** |
| **Масло подсолнечное "Золотое семечко", 1 л** | **5010** |
| **Масло сливочное "Крестьянское" 200 г** | **3040** |
| **Макароны, 1 кг** | **2370** |
| **Крупа рисовая, 1 кг** | **4120** |
| **Крупа гречневая, 1 кг** | **2960** |
| **Сельдь развесная, 1 кг** | **5960** |
| **Водка "Северная Губерния", 0,5 л** | **8090** |

## ЗАБУДОВА НА ПЕРСПЕКТЫВУ

Сёлетняй вясною у Крывым Сяле распачалося будаўніцтва аграгарадка. На гэтым аб'екце працуюць будаўнікі Шумілінскага ПМК-70. Пры гэтым кожны дзень сюды прывозяць па 10-12 рабочых і спецыялістаў. Цяпер запланавана жыллё для калгаснікаў – чатыры домікі. У кожным доміку будзе тры пакоі і сучасныя даброты - вадаправод і каналізацыя. Трэба адзначыць, што падчас крызісу кошты будаўнічых матэрыялаў істотна падражэлі. Узвядзенне аднаго дома вырасла да 150 мільёнаў рублёў. Вясковыя жыхары будуць мець магчымасць вырошчваць жывёлу на новых сядзібах. Гаспадарчыя прыбудовы і хлявы зробяць больш прасторнымі. Адначасова працягваецца разбудова райцэнтра. Свае шумілінскія будаўнікі ўзводзяць два 48-кватэрныя жылыя дамы на вуліцы 40 год кастрычніка. Праўда і тое, што будаўнікі адсталі ад графіка на месяц. Спецыялісты мяркуюць, што з-за моцных маразоў адбылося прамярзанне грунту, якое не дазволіла хутка выкапаць катлаван пад фундамент. Зараз работы ідуць у дзве змены – аб'ект павінны быць здадзены да зімы. І гэта яшчэ не ўсё. У бліжэйшы час пачнецца будаўніцтва 32-х кватэрнага дома ў пасёлку Мікіціха. Цэнтр саўгаса "Лаўжанскі" чакае маладых спецыялістаў. Увогуле, справа знойдзецца кожнаму жыхару раёна.

**У. Арэшкін.**

## АБ'ЯВА

*• Каб атрымліваць кожны нумар газеты «Світанак» паведаміце рэдакцыі аб гэтым – зрабіце бесплатную падпіску.*

*• Рэдакцыя « Світанка » змяшчае бясплатныя абвесткі чытачоў выдання. Дзеля размяшчэння абвесткі запоўніце купон або патэлефануйце ў рэдакцыю.*

*• Калі парушаны вашы правы спажыўца, працаўніка, то даем эфектыўныя парады па абароне права і пошуку бясплатных юрыстаў. Звяртайцеся на адрас газеты «Світанак».*

*• Рэдакцыя запрашае да супрацоўніцтва неабыякавых грамадзян. Вашы навіны, паведамленні – наша падзяка. Словам, сувенірам.*

# ПРАБЛЕМА ВЫБАРУ І ВЫБАРЫ

**Здрабнела, канечне, сённяшняя ўлада ў параўнанні са сваімі папярэднікамі, не кажучы ўжо пра асновазаснавальнікаў. Тыя Гегеля пачытвалі, Кантам не грэбавалі, за перапіскай Энгельса з Каўцкім сачылі. Да таго ж залатое цяля папсавала нястойкія да абывацельскіх дабротаў душы сучаснай наменклатуры. Раней, за Саветамі, усе вялікія справы і здзяйсненні прымяркоўваліся да знамянальных датаў, а зараз, напрыклад, усе перабудовы пад еўра робяцца ў Віцебску да Славянскага базара. Толькі выбары ўлада, відаць, пад Чарнобыльскую катастрофу адмыслова падагнала, бо падсвядома гэтыя падзеі даўно ўжо маюць для гэтай зямлі аднолькавыя наступствы.**

Увесь час дзіўлюся наколькі заможная існая дзяржава: спачатку дае грошы на брукаванне ходнікаў ці вакзальных платформаў, а затым вырашае зняць гэтыя бетонныя пліткі ды пракласці трубаправод, каб зверху пакласці ўжо новы брук. Цікава хто гэта ў горадзе лабіруе інтарэсы плітачна-заборнай, а яшчэ асфальтавай мафіі? У Нарвегіі, да прыкладу, асфальт кладзецца з гарантыяй на 50 гадоў. У нас жа тэхналогіі свае, самаробныя: у асфальт, пэўна, адмыслова кладуць нейкія рэчывы, што яго тэрмінова разбураюць ці памягчаюць. Па каляіне, мусіць, ехаць куды прасцей—збочваць не трэба.

Вось і выбары тут праводзяць па наезджанай каляіне: адна цэлая тры сотыя кандыдата на адзін выбарчы участак, праверaныя чальцы ў выбарчых камісіях, шалёнае датэрміновае галасаванне, загадзя размеркаваныя вынікі і назіральнікі на адлегласці, што не дае магчымасці дакладна бачыць працэс падліку галасоў.

Калі прасачыць за тым, што для ўлады з'яўляецца прыярытэтным, то вымалёўваецца такая сітуацыя. Выбары па-беларуску—аснова стабільнасці. Улада і палітычна-сацыяльнае ўладкаванне жыцця—рэчы нязменныя. У гэтым пераканана і ўлада, і вялікая частка народу. На парушэнне правоў чалавека, на існаванне пячорнага выбарчага заканадаўства, на навакольны маральна-культурны прымітывізм ўвагі ніхто не звяртае.

Паказушнасць—другі кіт на, якім грунтуецца тутэйшая рэчаіснасць. Сюды можна ўлучыць жытловае будаўніцтва, рэканструкцыю і аднаўленне культавых і культурных аб'ектаў і г.д..

Амаль поўная працоўная занятасць пры сярэднім заробку ў 700 тыс. руб.—яшчэ адно супервынаходніцтва існага рэжыму. Невялікія грошы змушаюць людзей адчуваць залежнасць ад існае сістэмы, якая праз кантрактную сістэму, выпрацаваныя псеўдаўстаноўкі і стэрэатыпы паводзін уплывае на чалавека, які прызвычайваецца слепа падпарадкоўвацца, не задумваючыся над мэтазгоднасцю і маральнасцю ўсяго, што адбываецца навокал.

Можна было б прывесці яшчэ шэраг важных, дзейсных рычагоў уплыву на грамадства і асобнага чалавека, але гэта не дадасць нічога новага да ўжо сказанага. Сістэма працуе на псеўдастабільнасць. Чаму псеўда? Ды таму, што ўся гэтая сістэма паразітарная па сваёй сутнасці. З верху да нізу ў ёй адсутнічае аснова любога нармальнага жыцця—канкурэнцыя. Сродкі масавай інфармацыі манапалізаваныя, парламентары і прэзідэнт дуюць у адну дудку, грамадскія стасункі ў асноўным фармалізаваныя. Пры такой адзінадушнасці хутка можна дакаціцца да поўнай разумовай інфантыльнасці ды дэградацыі.

Уладзе чамусьці падаецца, што калі не казаць пра ахвяраў сталінізму, пра галадамор, не пераглядаць выпрацаваных стэрэатыпаў пра вайну, не гаварыць пра апазіцыю і тых, хто яе падтрымлівае, дый яшчэ не казаць шмат пра што, то ўсё рассасецца само сабой. Аднак гэта ж не так. За прывабнасцю знешняга фасада ўлада імкнецца схаваць глыбінныя праблемы нашага нацыянальнага існавання. Яна наіўна мяркуе, што створанае ёю на вякі.

Замест таго, каб у 1994 годе прыняць пошукававырыятыўнае стаўленне да жыцця, як да вечна зменлівай існасці, тутэйшае жыхарства пайшло па наезжанай каляіне савецкіх уяўленняў, дзе дзяржаве дадзена права думаць і прымаць рашэнні за ўсе існыя грамадскія станы.

**Ян Сведка.**

## ВЯДОМЫЯ ЗЕМЛЯКІ

# ГІСТОРЫК З КАЗЬЯН

Даўгяла Дзмітрый Іванавіч, нарадзіўся ў 1868 годзе ў вёсцы Казьяны Мішневіцкага сельсавета. Закончыў народнае вучылішча, Віцебскую і Петярбургскую семінарыі. Працаваў настаўнікам. З 1897 года загадчык Віцебскага цэнтральнага архіва старажытных актаў, супрацоўнік Віленскага НАСА. У 1921-1925 гадах загадчык Магілёўскага архіва. Потым працаваў у Інстытуце беларускай культуры, дырэктарам бібліятэкі АН БССР, у Інстытуце гісторыі АН БССР. Памёр Даўгяла Дзмітрый Іванавіч у 1942 годзе.

# АКАДЭМІК ВЕТЕРЫНАРЫІ

Сяргей Міхайлавіч Вышалескі, савецкі эпізатолаг, акадэмік АН БССР (1928), заслужаны дзеяч навук РСФСР (1940). Нарадзіўся ў Обалі ў 1874 годзе. У 1899 годзе закончыў ветэрынарны інстытут. Займаўся ветэрынарнай практыкай, затым навукова-педагагічнай дзейнасцю. За падручнік "Прыватная эпізаталогія" атрымаў дзяржаўную прэмію СССР (1948 г. ) памёр С. М. Вышалескі ў 1958 годзе.

# Як выправіць хібы сямейнага жыцця

Пасля прыняцця дэкрэта № 18 цяпер стала больш кантралюючых органаў, якія працуюць з "цяжкімі сем'ямі. Сітуацыя з няўдалымі сем'ямі ў раёне была не лепшая і да выхаду дэкрэта. Проста раней гэтай справай займаліся камісія па справах непаўналетніх, інспекцыя па справах непаўнагадовых. А Дэкрэт абавязаў працаваць усе службы ў адной запрэжцы. Разам з тым сталі больш жорсткімі меры, якія прымяняюць да гора-бацькоў. Кожная служба, кожная арганізацыя ў большасці выпадкаў адчула сваю адказнасць за становішча спраў у няўдалых сем'ях. Цяпер не толькі школу гэта стала хваляваць, але абсалютна ўсіх. Напрыклад, кіраўнік СВК сёння на роўны з з дырэктарам школы павінен клапаціцца за становішчам спраў у такой сям'і. Здараліся ў раёне выпадкі, калі калі старшыня калгаса садзіў калгаснікаў у аўтобус "аматараў" спіртнога і вазіў да ўрачоў-нарколагаў на "кадзіроўку". П'янства і алкагалізм бацькоў пакуль што з'яўляецца асноўнай прычынай , па якой дзеці трапляюць у сацыяльна-небяспечнае становішча.І тут дзяржава ў якасці крайняй меры ўздзеяння была вымушана пазбаўляць бацькоў правоў. Дзяцей у нядбайных бацькоў забіралі ў дзяржаўныя ўстановы і раней, але з выхадам Дэкрэта ўвага была сканцэнтраваная менавіта на ўзмацненні адказнасці абавязаных татаў і маці па кампенсаванні расходаў на ўтрыманне малых. Адпаведна ўзрасла і адказнасць бацькоў за выхаванне дзяцей. Здавалася б, сумесная скаардынаваная дзейнасць магла б даць станоўчы эффэкт. Аднак апошнім часам статыстыка паказвае, што нягледзячы на прынятыя меры, колькасць неблаганадзейных сем'яў не змяншаецца. Калі ў чалавека забіраюць дзіця ў прытулак, ён лічыць сябе абавязанай асобай і пералічвае грошы прытулку. У Шумілінскім раёне зараз на кантролі ў судовага выканаўцы знаходзіцца 235 выканаўчых вытворчасцей у адносінах да 130 абавязаных асобаў. Абавязаных асоб, як правіла, уладкоўваюць на прадпрыемствы. Не сакрэт, што далёка не ўсе арганізацыі ахвотна бяруць абавязаных асобаў у штат – гэта не самыя надзейныя работнікі. І тым не менш, пераважная большасць з іх, каля сотні чалавек працаўладкавана. Сярод данай катэгорыі асоб налічваецца шасцёра пенсіянераў, дванаццаць чалавек знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі, пяцёра – у лячэбна-працоўным прафілакторыі. З дапамогай суда Шумілінскага раёна і іншых зацікаўленых асоб з даўжнікамі праводзіцца індывідуальная работа. Усяго за перыяд дзеяння Дэкрэта № 18 на ўтрыманне дзяцей спагнана 370 мільёнаў рублёў. Магчыма сітуацыя, калі рашэннем суда – пры наяўнасці важкіх прычын – сума штомесячных выплат на дзяцей можа быць зменшана. Але кампенсаваць расходы дзяржавы цалкам усё адно прыйдзецца, проста гэты працэс расцягнецца на значна большы перыяд.За тыя паўгода, што няпоўнагадовыя знаходзяцца ў прытулку, нядбайныя таты і маці маюць шанц узяцца за розум ( навесці парадак у хаце, закадзіравацца, працаўладкавацца) – тады дзяцей ім вяртаюць. На сённяшні дзень у нашым раёне чатыры сям'і ўжо былі адноўлены ў сваіх правах. У адваротным выпадку гора-бацькі будуць абавязаны аплачваць утрыманне дзяцей гадамі, пакуль тыя не вырастуць. Зразумела, што толькі рэзервацыя абавязаных асоб – не выйсце. Аднымі дэкрэтамі і пакараннямі немагчыма нармалізаваць сямейныя адносіны. Для гэтага патрэбен больш глыбокі аналіз тых прычын, якія прыводзяць жыхароў раёна да цяжкой жыццёвай сітуацыі.

**С. Горкі.**


## Прыватныя абвесткі

***Продам:***

***Шумилинский район, д. Солодухи. Дом, дерево, 53 кв. м, на вывоз, 2 тыс у.е. Тел. 8-033-611-27-68 МТС***

***Г.п. Шумилино. 1 комн., квартира, 1/5 эт., пан., 36/19/9 кв.м, с/у разд., линолеум, встроенный шкаф в прихожей, Тел. (0212) 20-25-40 гор., Тел. 8-029-297-01-73, гор.***

***Г.п. Шумилино .2-х комн. Квартира, 1/3 эт. Кирп. 40/25/6 кв. м, с/у разд., тел., 1-й этах высокий, домофон, подвал. Тел (02130) 4-24-26. Тел. 8-029-510-85-91 МТС***

***Г.п. Шумилино 2-х комн. Квартира, 1/3 этаж, кирпич, 50, кв. м. Тел 8029-341-44-64. Велком***


# БІЯЛАГІЧНАЯ ДАБАЎКА АЧЫШЧАЕ РУХАВІК

У мінулым годзе сельгаспрадпрыемствы нашага раёна набылі 474 тысячы тон дызельнага паліва. Паводле А. І. Мясаедава , намесніка начальніка райсельгасхарчу, гэта паліва не зусім звычайнае. Яно мае яшчэ адну адметнасць: біялагічную дабаўку. Зрасходаваная колькасць такога паліва саставіла 20 адсоткаў ад агульнага аб'ёму спажывання. Пры ўсім тым удалося с'эканоміць грошы і закупіць 123 тоны паліва. Тым больш, што за літр паліва з біядабаўкамі трэба заплаціць 2090 рублёў. У той час, як звычайнае дызельнае паліва каштуе 2430 рублёў за літр. Ужо два гады на шумілінскай АЗС запраўляюць палівам з біядабаўкамі – ДТ-Б5. Насамрэч, гэта паліва мала чым адрозніваецца ад традыцыйнага. На 95 адсоткаў нафтавага дызельнага паліва айчыннай вытворчасці прыходзіцца 5 адсоткаў дабавак – метылавых эфіраў тлустых кіслот, якія атрымліваюць з рапсавага масла. Як сведчаць спецыялісты, біяпаліва ачышчае фарсункі ў рухавіку, да таго ж змяншаецца шумнасць і дымнасць матораў. А гэта азначае, што інжынеры прадпрыемстваў упэўнены ў якасці біялагічнага паліва.

**Я. Вайтовіч.**

# ПОСЛАНИЯ ГЛАВЫ ГОСУДАРСТВА: СЛОВА И ДЕЛА

**С ежегодным посланием к Национальному собранию и народу Александр Лукашенко обратится 20 апреля. Накануне мы просмотрели его выступления последних трех лет и сравнили, как реализуются его слова на деле.**

Вот лишь некоторые тезисы, которыми ублажал слух своих граждан в ежегодных посланиях президент.

Слово: «Неоспоримым преимуществом нашей модели экономического развития является то, что мы не влезли в долги. Кредит – это капкан, в который попадем даже не мы, а наши дети и внуки. Ни в коем случае нельзя допустить, чтобы кредит превратился в средство давления на нашу страну». (2007 год)

Дело: Тот факт, что наша страна все прочнее садится на кредитную иглу, с каждым годом наращивая темпы заимствований, уже не вызывает ни у кого сомнений. К 2010 году Беларусь успела наскрести по сусекам кредитов на 22 млрд долларов и, судя по всему, не собирается останавливаться на достигнутом. Поменялась и риторика главы государства: в 2009 году он уже заявлял, что, получив международные кредиты, наша страна получила «запас прочности» и ни слова о жизни без долгов как о неоспоримом преимуществе нашей экономической модели.

Слово: «В последнее время, особенно в России многие ёрничают: неужели Лукашенко повезет из Азербайджана, Ирана и Венесуэлы нефть в Беларусь, когда российская выгоднее. Конечно, не повезет». (2007)

Дело: Не прошло и трех лет, как венесуэльская нефть прямиком отправилась в наши края. По железнодорожным путям через Одессу уже побежали первые вагоны с черным золотом. И хоть объемы и экономическая выгода такой сделки выглядят сомнительно, в России уже не ёрничают. Там прямо крутят у виска.

Слово: «Если и будет приватизация, она будет открытой и честной. Никакой номенклатурной, клановой, как я сказал, и недобросовестной приватизации в стране не будет… Объекты будут продаваться только по конкурсу или через аукцион... Конкурировать между собой будут не фамилии или покровители, а бизнес–планы и социальные программы по поддержке трудового коллектива» (2007).

Дело: Насколько честна и прозрачна у нас приватизация, можно пронаблюдать на ряде недавних сделок. Достаточно припомнить продажу лакомого куска в центре Минска, который достался Оману за символическую сумму в 10 млн. долларов. Не менее «темной» оказалась и история с продажей госпакета акций СП МЦС (Velcom). Оглашения суммы вырученных средств пресса не могла добиться очень долго. В той же череде стоит и покупка швейцарской компанией Franck Muller часового завода «Луч»… Кстати, относительно последнего, слова тоже несколько разошлись с делом.

Слово: «Но главная задача здесь еще состоит и в том, чтобы сохранить это производство в стране. Оно исторически принадлежит нашей стране. Точно так по часовому заводу. Не знаю, чего там ждут и правительство и Павлов. Ждут, когда я приеду на часовой завод, губят его и дальше, некоторые говорят, давайте его закроем. Людей трудоустроим – не проблема. Вопрос не в этом – можно и МТЗ закрыть, и МАЗ закрыть. Так а с чем мы останемся? Это тоже наш брэнд. Сегодня часы, оказывается, в мире выпускают меньше стран, чем самолеты. Это высочайший уровень технологий».

Дело: Чем закончилось сохранение «брэнда», всем известно. Завод продали швейцарцам за 12,41 миллиона долларов. Эксперты назвали эту сделку полным абсурдом и предположили, что она нужна была только для того, чтобы прикрыть какие-то другие, которые не афишируются.

Слово: «С 1 апреля (2009 года – «С») в убыток работать преступно. Работа в убыток — это завтрашняя катастрофа. То же касается и работы на склад… Мы будем на корню пресекать попытки иждивенческих настроений у хозяйствующих субъектов».

Дело: На 1 февраля складские запасы составили 75,3%. При этом рост запасов зафиксирован во всех отраслях белорусской промышленности. С чистым убытком на конец 2009 года сработало каждое пятое предприятие — 18,6%. Сумма убытка составила 785,9 млрд рублей, или в 3,5 раза больше, чем в аналогичный период прошлого года. В общем, на лицо преступный замысел.

Слово: «С нынешнего года мы принципиально изменим подходы к оценке работы сельхозпредприятий. Сейте то, что будет приносить прибыль. Но на государственные дотации не рассчитывайте».

Дело: Слова о сокращении дотаций сельскому хозяйству звучат из уст президента с завидным постоянством. Между тем, по словам вице-премьера Ивана Бамбизы, только в 2009 году на аграрный сектор из бюджетов всех уровней было направлено 4,6 трлн рублей, что на 30% выше уровня 2008 года. Вместе с тем, несмотря на такую поддержку, рентабельности в сельхозорганизациях снизилась до 14,2% против 18,7% в предыдущем году, в том числе от реализации продукции — 4,2% против 6,3%. Это при том, что планы стояли амбициозные — обеспечить уровень рентабельности сельхозпроизводства не ниже 22-25%. Снизилась также чистая прибыль предприятий сельского хозяйства. Она составила 1,4 трлн рублей, или 86% к уровню 2008 года.

Слово: «Налоги призваны стимулировать плательщиков к легальной уплате налогов и сборов. Схема налогов должна быть простой и понятной» (2008 год).

Дело: Казалось бы, некоторые подвижки в этой области были сделаны. Однако в ноябре 2009 года Всемирный банк, Международная финансовая корпорация и PricewaterhouseCoopers опубликовали шестое ежегодное исследование «Уплата налогов 2010. Международный обзор». В рейтинге по простоте уплаты налогов Беларусь в очередной раз заняла последнее 183-е место.

Слово: «Основной вопрос, который будоражит наши умы: кто же будет строить станцию в Беларуси. Этот вопрос в кулуарах решаться не будет. Это будет открытый конкурс. Конечно, нам не хотелось бы – я уже послу России об этом говорил, — чтобы мы складывали яйца в одну корзину. Мы зависим и так по другим видам энергии от России, не хотелось бы зависеть и в строительстве АЭС только от Российской Федерации. Это я говорю честно. Мы хотели бы, чтобы АЭС построили, может быть, другие» (2007).

Дело: Как ни «противился» президент, а «честный» конкурс выиграли именно россияне. «Складированию яиц» существенно поспособствовал обещанный Россией под строительство АЭС кредит. А конкуренты отдыхают: «Слушайте, посмешище! Мы им предлагаем за блок почти два миллиарда долларов, а они перед нами ставят условия, какое у вас будет предвыборное законодательство...», — возмущался президент.

Слово: «Задача правительства, всех республиканских и местных органов управления — даже в условиях роста цен на энергоносители сохранить в этом году (2007-м – «С») положительную динамику снижения темпов инфляции и по итогам года выйти на целевые параметры, предусмотренные в прогнозе социально–экономического развития страны, — 6—8%».

Дело: Тогда по итогам 2007 года официальный рост потребительских цен составил 12,1%, или в 1,51 раза больше верхнего предела. Больше столь амбициозных задач президент не ставил.

Слово: «Сергей Сергеевич (Сидорский – «С»), надо возвращаться к требованию повышения заработной платы. Другого пути нет. На конец пятилетки нам надо заработную плату довести, боюсь говорить, до 700 долларов, никуда не денемся. 500 долларов будет мало. Надо 700 – среднюю зарплату по стране. Тогда мы сможем удержать стабильность в нашем обществе». (2008)

